# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ НАРОДНАЙ ЦАЦКІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ.

С.У. Касцюкевіч
г. Наваполацк

Другая палова дваццатага стагоддзя прынесла ў этнаграфічную навуку не толькі новыя метады, але і новыя аб'екты для даследавання. Такім аб'ектам з'яўляецца дзіцячая культура, на якую этнографы папярэдніх перыядаў не звярталі ўвагі. Адным з аспектаў вывучэння дзіцячай культуры стала народная цацка. Асноўнымі праблемамі даследавання зрабіліся праблема ўзнікнення цацкі і гісторыя развіцця народнай цацкі.

Падставай для параўнаўчага аналіза гістарыяграфіі вывучэння цацкі ў Польшчы і Беларусі з'яўляецца не толькі тэрытарыяльная блізкасць, але і тое, што самі працэсы абуджэння цікавасці да гульнёвай культуры і цацкі Беларусі і Польшчы маюць шмат падабенства.

У польскай гістарыяграфіі цікавасць да праблем гульні і цацкі праяўляецца ў розных аспектах: педагагічным, этнаграфічным, псіхалагічным, тэхнічным і г.д. [1, 89]. Першыя значныя працы па гісторыі развіцця народнай цацкі пабачылі свет у 60-я г. XX ст. Іх з'яўленне было выклікана перш за ўсё накапленнем значнай колькасці матэрыялу ў музейных калекцыях і неабходнасцю яго апрацоўкі. У 60-я гады XX ст. найбольш аўтарытэтным знаўцам па дадзенай праблематыцы быў Тадэвуш Севярын [2]. Шырокую вядомасць сярод спецыялістаў набыла манаграфія Яна Буяка «Цацкі ў Еўропе» [3], некалькі разоў перавыдадзеная. Яна ўяўляе сабой разгляд і характарыстыку цацкі, пабудаваную па тэрытарыяльнаму прынцыпу, дзе даследуюцца цацкі Расіі, Англіі, Францыі і іншых краін, значная ўвага нададзена аўтарам выставам і конкурсам, на якіх прадстаўлены забаўкі, калекцыянерскай дзейнасці, характарыстыцы навукова-даследчай дзейнасці яго папярэднікаў у гэтым напрамку і г.д.

Звернем увагу на працу па музейным зборам цацачнай прадукцыі аўтарскай суполкі Яна Буяка і Багданы Пілічоўскай «Цацкі – даследчыя патрэбы, праблемы тэарэтычныя, музейныя зборы» [4], надрукаваную ў «Доследах і матэрыялах» Музея Цацкі ў Кельцах. Праца Малгажаты – Піхлішэй «Што дарослы аб цаццы ведаць павінен» [1, 91] ўтрымлівае педагагічныя парады і элементы гісторыі пахождання цацкі. У кніжцы Тэрэзы Лявіньскай «Каляровы свет забавак» [5] цацка разглядаецца ад ста-

ражытных конікаў, птахаў, зробленых з дрэва да сучасных механічных цацак. Некаторыя даследчыкі польскай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме адзначаюць, што існаваў недахоп польскай літаратуры ў галіне тэхнікі, тэхналогіі, тавараэнаўства і эканомікі ў дачыненні цацкі. Аднак, у апошнія дзесяцігоддзі дваццатага стагоддзя гэтая «ніша» была запоўнена працамі Рычарда Зензё [6], Рычарда Кантара [7], Урсулы Кашмарэк [8], Лешак Дзенгела [9] і інш. Рычард Зензё «З доследаў агульных ведаў аб цацках і цацачным промысле. Уступ да доследаў» [1], «Цацкі Яна Пука і Станіслава Нарога...» [10], «Мадэлярства ў музеі...» [11] – звяртае ўвагу на калекцыі цацак народных майстроў; Рычард Кантар «Чалавек – цацка. Нарыс з пагранічча чалавечнасці і філасофіі чалавека» [12], «Таварыства развіцця цацачнага промысла – рэчаіснасць і надзеі» [13] – імкнецца паказаць развіццё гульні і цацкі, зыходзячы з пазіцый найноўшых тэорый (Р. Каюа і інш.); Малгажата Аляшкевіч «Цацкі вясковага дзіцяцці. Выстава са збораў этнаграфічнага музея ім. Севярына Удзелы ў Кракаве» [14] – апісвае цацкі XIX – пач. XX ст. і г.д.

Без увагі даследчыкаў не застаюцца праблемы сучасных цацак, іх уздзеяння на чалавека, праблемы стасункаў традыцыі і трансфармацыі ў сучасную гульнёвую культуру рысаў гістарычнай рэчаіснасці: Івона Кабзіньская «Не куплю ўнукам тамагочы « [15], Марэян Рынкоўскі «У краіне дзяцей са «Светам дзіцяці» [16], Бажэна Альшэўская “Польская народная цацка” [17], Тэрэзы Лявіньскай [18] і г.д.

На сённяшні дзень у Польшчы існуюць выданні, цалкам прысвечаныя цаццы. Гэта квартальнік «Цацкі і гульні» [19]. Мэтай квартальніка з`яўляецца звяртанне ўвагі грамадскасці да праблем мясцовай вытворчасці цацак, распаўсюджання народных гульняў і забаў сярод насельніцтва. Змяшчаемыя ў часопісе матэрыялы не абмяжоўваюцца толькі падзеямі на тэрыторыі Польшчы. Частка іх датычацца падзей у іншых краінах: «Музей цацак у Хагнау (Бадэнія - Віртэнбергія, Германія)», Бослер Г. Дас Клеін «Музей, ксеракопія артыкулу інфармацыйнага (тлум. Г.Гзервіньскага)» 1997, [1, 92] і інш. На працягу апошніх дзесяці год ў Польшчы выйшла каля 240 артыкулаў і нататак, якія датычацца цацкі, цацачных промыслаў і гульнёвай культуры. Матэрыялы, прысвечаныя цаццы, друкуюцца ў «Аглядзе», «Грамадскай працы», «Сяброўцы», «Кабеце і жыцці», «Сцене», «Пераменах», «Люстэрку», «Кулісах», «Стандарце маладых», «Рэху дня», «Слове люду», «Выбарчай газеце» і іншых часопісах і газетах [1, 93]. Паводле тэматычнага прынцыпу найбольшая колькасць публікацый звязана з буйнымі падзеямі ў свеце вывучэння гульнёвай культуры і цацкі: утварэннем Музея Цацкі ў Кельцах, выставе цацак з Нюрнбергу ў Этнаграфічным музеі горада Кракава, Міжнародным фестывалем лялькі ў Бельску-Бялым, выставе ў Музеі лялечных відовішч у Лодзі, рэгіянальнай выставе “Лялькі Света”. Часцей за

усё артыкулы аб цацках і цацачным промысле з`яўляліся ў 1979-1981 гадах, затым, у 1982, 83, 84 ідзе зніжэнне цікавасці да гэтай з`явы сярод польскіх даследчыкаў. Аднаўленне цікавасці і павелічэнне колькасці публікацый было звязана з Агульнапольскім цацачным форумам [1, 93-95].

Рэгулярна праводзяцца ў Польшчы міжнародныя канферэнцыі і чытанні, прысвечаныя цаццы і гульні. На іх народная цацка разглядалася як прадмет навуковых міждысцыплінарных даследванняў і як феномен культуры [20].

Ёсць важная акалічнасць, якую нельга не адзначыць у польскай гістарыяграфіі, і якая датычыцца вывучэння цацкі: пры даволі шырокай цікавасці да праблематыкі памежжа і памежных рэгіёнаў, у польскай літаратуры дрэнна вывучаны ўзаемаўплывы польскай і беларускай цацкі. У Кракаўскім Этнаграфічным музеі ёсць калекцыя беларускіх цацак, аднак, іх з“яўленне там насіла выпадковы характар і таму пры іх апісанні і музеефікацыі ўзніклі некаторыя праблемы. Дарэчы, для параўнання: зусім іншая сітуацыя з украінскай цацкай. Яе зборы добра апісаны, датаваны і значна больш шырокія.

У беларускай гістарыяграфіі праблема гульнёвай культуры і цацкі таксама асвечалася рознымі даследчыкамі і ў розных аспектах: выхаваўча-педагагічным, этнаграфічным, гістарычным, мастацкім і г.д. Аднак, агульнай характарыстыкай усёй дадзенай літаратуры з“яўляецца тое, што яна не носіць сістэматычнага, комплекснага характару. Праблемы цацкі і гульнёвай культуры разглядаюцца як бы мімаходзь, як спадарожныя іншай праблематыцы. Калі ж разглядаецца цацка як асобная з“ява, то падкрэсліваецца толькі адзін аспект.

Зборам калекцый беларускай народнай цацкі займаліся яшчэ этнографы XIX ст. Аднак, на жаль, калекцыі былі ці знішчаны, ці вывезены за мяжу. Вывучэнне беларускай цацкі мела эпізадычны характар у савецкай літаратуры, і толькі ў 80 - 90 гады XX ст. да яе назіраецца значная цікавасць даследчыкаў. Пачалі з“яўляцца публікацыі асобных аўтараў па гэтай тэматыцы. Глеба для вывучэння народнай цацкі была падрыхтавана доследамі, прысвечанымі дзіцячым гульням і дзіцячай культуры ўвогуле. Упершыню найбольш поўна дзіцячыя гульні былі сабраны ў томе «Дзіцячы фальклор» (1972). У ім змяшчаецца 191 гульня, дадзены аглядальны артыкул Г.А.Барташэвіч і В.І.Ялатава. Зборнік «Гульні, забавы, ігрышчы» [21], што выйшаў у 1996 г. У выданні ўвага звернута на класіфікацыю беларускіх народных гульняў, уключаны тэксты гульняў, якія не ўвайшлі ў папярэднія выданні кнігі серыі «Беларуская народная творчасць». Пры падачы тэкстаў аўтары імкнуліся захаваць стыль інфарматараў, іх мову. Як адзначаюць самі даследчыкі, гульнёвы матэрыял мае ў навучальным і выхаваўчым працэсе сучаснай школы неацанімае значэнне [21, 14].

Шмат увагі ўдзяліў збіранню і вывучэнню гульняў, пераважна фізічных Я.Р.Вількін. Акрамя пытанняў гісторыі народных гульняў, іх арганізацыі і класіфікацыі, фізічнай культуры беларусаў. Ім даследавана 300 варыянтаў гульняў, запісаных да рэвалюцыі і ў савецкі час, многія тэксты з якіх прадстаўлены ў зборніку «Беларускія народныя гульні» [22]. Вывучаюць народныя фізічныя гульні таксама Я.Гелер, Л.Геркан, К.Кулінковіч і інш [21, с. 14]. Пытанню тэатральных элементаў у народных гульнях прысвечаны працы Г.Барташэвіч [23], М.Каладзінскага [24]. Маюцца зборнікі для работы з дзецьмі (Гершэнзон М.А. «Вясёлы час: Кніга забаў, самаробак і гульняў» [25]; «Беларускія гульні ў дзіцячым садзе: Дапаможнік для выхавальніка» [26]). Шмат запісаў гульнёвага фальклору ў архівах ІМЭФ НАН Беларусі, вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Тэарэтычнае даследаванне гульневага фальклору праводзіла даследчыца Г.А.Барташэвіч у кнізе «Вершаваныя жанры беларускага дзяцічага фальклору» [27], а таксама у шэрагу сваіх артыкулаў. Па-за ўвагай вышэйназванай кнігі аказаліся «дарослыя» гульні, у тым ліку каляндарна- і сямейна-абрадавага характару. Не ўключыў усё багацце гульнёвай народнай творчасці і том «Народны тэатр», які шмат у чым дапаўняе папярэдні збор. У ім знайшлі месца як пазаабрадавыя тэатралізаваныя гульні, так і каляндарныя гульні. Рознымі аспектамі гульнёвых жанраў займаліся і займаюцца таксама М.Я.Грынблат, П.А.Гуд, В.Я.Гусеў, К.П.Кабашнікаў, Л.В.Карманава, В.Д.Ліцвінка, З.Я.Мажэйка, С.А.Місько, В.В.Сакалова, Л.М.Салавей, А.С.Фядосік, В.І.Ялатаў і інш [21, 15].

Звяртаецца да праблем гульні ў традыцыйнай педагогіцы беларусаў Л.В.Ракава «Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай весцы» [28]. У яе кнізе, дзе аналізуюцца традыцыйныя формы, метады і сродкі выхавання дзяцей у беларусаў у раздзеле «Гульні і забавы ў выхаванні дзяцей» даецца ўзроставая характарыстыка гульняў, а таксама агульная характарыстыка дзіцячых цацак, характэрных для XIX – пач. XX стст. [28, 72-73].

Звычайна ў літаратуры падзел цацак адбываецца паводле матэрыяла, з якога тыя выраблялiся. Такі ўмоўны падзел прынялі даследчыкі Я.М-.Сахута [29] і М.С.Ржавуцкі [30]. Пры разглядзе цацкі акцэнты рабіліся перш за ўсё на яе мастацкія якасці, матэрыял і тэхналогію вырабу. Недастаткова ўвагі ўдзялялася яе асноўным функцыям, стасункам цацкі з гульнёвай дзейнасцю дзяцей. У кнізе Я.М.Сахуты цацка разглядаецца як з"ява дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якой праявіліся асноўныя законы і заканамернасці развіцця гэтай галіны мастацкай культуры. Даследчык звяртае ўвагу перш за ўсё на дэкаратыўныя асаблівасці цацкі, аднак падае і гісторыю развіцця беларускай народнай цацкі, звяртае ўвагу на міфалагічныя сюжэты, увасобленыя ў дадзенай з"яве народнай культуры [31].

Цікавай з"яўляецца і манаграфія Ржавуцкага М.С. «Беларуская гліняная цацка» [30]. У ёй аўтар разглядае гліняную цацку і асаблівую ўвагу звяртае на гісторыю паходжання цацкі, разглядае асноўныя сюжэты цацкі. Каштоўнасць кнігі ў тым, што яна можа выкарыстоўвацца не толькі навукоўцамі, ці тымі хто цікавіцца цацкай, але і ў якасці метадычных рэкамендацый па вырабу цацкі майстрамі-цацачнікамі, ці, напрыклад, метадыстам дзіцячага гуртка народнай творчасці. Блізкай у гэтым сэнсе з"яўляецца кніга Церашковіч Т.А. «Лялька беларуская» [32]. Некаторыя цікавыя звесткі аб глінянай цацке ўтрымліваюцца ў выданнях 60-80 гадоў XX ст. і прысвечаных беларускай народнай кераміцы. Гэта кнігі Елатамцавай І.М. [33], Жука В.І. [34], Мілючэнкава С.А. [35] і г.д.

Звяртаецца ўвага на цацку і ў калектыўных працах, энцыклапедычных выданнях, такіх як «Беларусы. Промысловыя і рамесныя заняткі», «Гісторыя беларускага мастацтва», «История искусства народов СССР» в 9 т.; "Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік" [36] і інш. Аднак, у рамках дадзеных выданняў звесткі вельмі кароткія, што супадае з іх мэтамі – даць кароткія, дакладныя звесткі аб той ці іншай з`яве.

На пач. 90-х гадоў XX ст. з'явіўся шэраг артыкулаў маладых аўтараў: Дабравольскай А. «Беларуская народная цацка», Ракавай Л.В. «Побыт дзяцей у мінулым» [37], дзе звяртаецца ўвага на педагагічны і гістарычны аспекты развіцця. Але комплекснага вывучэння праблемы гісторыі развіцця беларускай народнай цацкі не адбываецца.

Гэты недахоп паспрабавалі выправіць арганізатары і супрацоўнікі беларускага навукова-метадычнага Цэнтра гульні і цацкі. Цэнтр падрыхтаваў і выпусціў у друк навукова-метадычныя дапаможнікі, кніжкі-цацкі для дзяцей, шэраг манаграфій. Толькі ў 1994 - 1995 гадах Цэнтрам знята чатыры дыяфільмы і два фільмы. Цэнтр дзейнічае пры дзіцячым садку № 376 у г. Мінску.

Нарэшце, да Беларусі "дайшла" еўрапейская мода на дзіцячыя і цацачныя музеі. У Полацку рыхтуецца да адкрыцця дзіцячы музей. Можна спадзявацца, што калі-небудзь ён стане такім жа цэнтрам цацкі, як дзіцячы музей у Загорску (Расія), ці Музей цацкі ў Кельцах (Польшча).

Падводзячы вынік дадзенаму дастаткова агульнаму агляду літаратуры па праблематыцы вывучэння цацкі ў Польшчы і Беларусі, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Як у беларускай, так і ў польскай гістарыяграфіі прысутнічае дастаткова шырокае кола літаратуры, прысвечанай гульнёвай культуры і цаццы. Аднак, аналізуючы паўнату даследаванасці дадзеных з"яў, цяжка сказаць, што яны вывучаны вычарпальна.

2. Польская гістарыяграфія па пытаннях гісторыі развіцця народнай цацкі больш багатая тэматычна, чым беларуская.

3. Пры разглядзе праблемы ў польскамоўнай і беларускамоўнай літаратуры надаецца ўвага асобным (этнаграфічнаму, псіхалагічнаму, тэхнічнаму, выхаваўчаму і інш.) аспектам, у той час як недастае абагульняючых прац. З"явы, якія знаходзяцца на памежжы, выпадаюць з-пад увагі даследчыкаў.

**Літаратура:**


1. Ryszard Zikzio Z zagadniec wiedzy potocznej o zabawkach i zabawkarswie. Wstкp do badac. // Gryd spustoszony. Kontynuacja i zmiana w kulturze wspyiczesnej wsi polskiej Materialy I Konferencji Naukowej zorganizowanej w dniach 20-21 kwietnia 1995 roku w Krakowie i Zubrzycy Gyrnej. Krakyw. 1995, s.89-96.
2. Seweryn T. Polskie zabawki ludowe. Warszawa. 1960.
3. Bujak Jan Zabawki w Europie. Krakyw. Nakiadem Uniwersytetu Jagiełocskiego. 1986. – 217 s.
4. Jan Bujak, Bogdane Pilichowcka Zabawki – potrzeby badawcze, problemy teoretyczne, propozycje muzcologiczne // Studia i Materialy. Kielce. Nr.3. 1995.
5. Teresa Lewicska Kolorowy њwiat zabawek. Kielce. 1995.
6. Ryszard Zikzio Technika i modele (z zagadniec zabawek technicznych i modelarstwa – wprowadzenie do badac). Kielce. 1995; Magia Zalki. Geneza i zmiennoњйfunkcji lalki. Red. Ryszard Zikzio. Plock. – Toruc. – Kielce. 1994.
7. Ryszard Kantor Towarzystwo Rozwoju Zabawka rstwa – Rreczywistoњж i nadzieje // Zabawy i zabawki, Kwartalnik. Rok 1. Nr.1-2. 1997, s.141-148.
8. Urszula Kaczmarek Pedagogika zabawy – njwy styl wychowania // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.5-14.
9. Zeszek Dzikgiel Futbol guzikowy. Nieznana gra dziecikca sprzed pyi wieku // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.105-106.
10. Ryszard Zikzio Zabawki Jana Puka i Stanisiawa Naroga szkic do badac translokacji funkcjonalnej przedmiotyw zabawowych // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.35-58.
11. Ryszard Zikzio Modelarstwo w museum. Refleksje w zwi№zku z VII Ogylnopolskim Konkursem Modeli Redukcyjnych w Kielcach // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.85-90.
12. Ryszard Kantor Cziowiek – zabawka. Szkic z pogranicza ludyzmu i filozlfii cziowieka // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.15-24.
13. Ryszard Kantor Towarzystwo Rozwoju Zabawkarstwa – Rzeczywistoњж i nadzieje // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.141-148.
14. Maigorzata Oleszkiewicz Zabawki dziecka wiejskiego. Wystawa ze zbioryw Muzeum Etnograficznego im Seweryna Udzieli w Krakowie. Krakow. 1999.

15. Jwona Kabzicska Nie kupiк wnukow tamagotchi // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.77-80.
16. Marian Rynkowski W kraine dzieci ze «Њwiatem Dzieci» // Zabawy i zabawki. Kwartalnik. Rok 1. Nr.4. 1997, s.63-72.
17. Bozena Olszewska Polska zabawka ludowa. Katalog wystawy. Toruc. 2000 .
18. Teresa Lewicska Kolorowy њwiat zabawek. Zabawki ludowe w Polsce. Muzeum zabawkarstwa w Kielcach «Studia i Materiaiy». Kielce. 1995.
19. Zabawy i zabawki. Kwartalnik roњwikcony zagadnieniom ludyzmu i ludycznoњci. Muzeum zabawkarstwa w Kielcach Towarzystwo Rozwoju zabawkarstwa w Kielcach. Rok I. Nr4. 1997.
20. Zbigniew A. Baran Dziecikce zabawy receptywne. (Sprawozdanie z mikdzynarodowej Konferencji) Krakyw, 21-24 paџdzirniva 1998 r. // Zabawy i zabawki, Kwartalnik. Rok 2. Nr4, 1998, s.50-75.
21. Гульні, забавы, ігрышчы. / Склад. А.Ю.Лозка. 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 1996.
22. Вилькин Я.Р. Белорусские народные игры 2-й пол. XIX – нач. XX в.: Дис. реф. на соиск. степени канд. ист. наук ИИЭФ АН РБ. Мн., 1970.
23. Дзіцячы фальклор / Склад. Г.А.Барташэвіч, В.І. Ялатаў. Мн., 1972.
24. Народны тэатр / Склад. М.А.Каладзінскі. Мн., 1983.
25. Гершэнзон М.А. Вясёлы час: Кніга забаў, самаробак і гульняў. Мн., 1954.
26. Беларускія народныя гульні ў дзіцячым садзе: Дапаможнік для выхавальніка / Склад. З.І.Ермакова, В.В.Шыбека. – Мн., 1987.
27. Барташэвіч Г.А. Вершаваныя жанры беларускага фальклору. Мн., 1976.
28. Ракава Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай весцы. – Мн.: Ураджай, 2000.
29. Сахута Я.М. Беларуская народная гліняная цацка. Мн., 1982.
30. Ржавуцкі М.С. Беларуская гліняная цацка. Мн., 1991.
31. Сахута Я.М. Беларуская народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мн., 1996; Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997.
32. Церашковіч Т.А. Лялька беларуская. Мн., 1992.
33. Елатамцева И.М. Белорусская народная керамика и её традиции в современном декоративно-прикладном искусстве Белоруссии. – Мн., 1966; Елатамцева И.М. Художественная керамика Советской Белоруссии. – Мн., 1966.
34. Жук В.И. Современная белорусская керамика. Тенденции развития. – Мн., 1984.
35. Милюченков С.А. Белорусское народное гончарство. – Мн., 1984.

36. Беларусы. Прамысловыя і рамесныя занядкі. Ч.1. Мн., 1995 г.; Гісторыя беларускага мастацтва ў 6 т. / Рэдкал.: В.Марцэлеў і інш. Т.6. – Мн., 1994 г.; История искусства народов СССР в 9 т. Т.6. Искусство 2 пол XIX – нач. XX вв. – М., 1981; Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Пад агул. рэд. В.С. Цітова; Маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. – Мн.: БелЭн, 2002.
37. Дабравольская А. Беларуская народная цацка // Настаўніцкая газета. 1992, 23 мая; Ракава Л.В. Побыт дзяцей у мінулым // Адукацыя і выхаванне. 1994 г., №9 і інш.